**П. Панамарэнка**

Сакратар ЦК КП(б)Беларусі

# Мастацтва беларускага народа

Беларуская культура і мастацтва неразрыўна звязаны з усёй гісторыяй беларускага народа, з яго ўпорнай, непрымірымай і гераічнай барацьбой з прыгнятальнікамі за сваю самастойнасць, за сваю культуру.

На працягу многіх стагоддзяў Беларусь падвяргалася насіллям, спусташэнням і разарэнням. Палі Беларусі таптал і полчышчы шведаў, французаў, палякаў і іншых прыгнятальнікаў.

Спрадвечны вораг беларускага народа—польскае панства на працягу вякоў імкнулася заняволіць яго, выкараніць беларускую культуру, мову, звычаі, уклад жыцця, насадзіць каталіцызм, апалячыць народ і вытравіць яго нацыянальную самасвядомасць.

Расійскае самадзяржаўе, якое паставіла Беларусь на становішча адсталай акраіны Расіі, адмаўляла беларускаму народу ў праве на сваю культуру, мастацтва і нават мову. Урад Нікалая I у 1840 г. афіцыяльна забараніў ужыванне слова «Беларусь». Прыгнятальнікі з польскага і рускага дваранства звысоку, пагардліва адносіліся да гучнай, прыгожай беларускай мовы. На гэтай «мужыцкай» мове забаранялася друкаваць і пісаць, ёю забаранялася карыстацца ва ўрадавых установах.

Беларускі народ, прыдаўлены страшэнным эканамічным, нацыянальным і палітычным гнётам, паўставаў супроць сваіх прыгнятальнікаў. Ён знішчаў чыноўнікаў польскага караля, тапіў у балотах памешчыкаў, паліў панскія маёнткі, сустракаў са зброяй у руках карныя атрады жандармаў.

У народнай памяці захаваліся сказанні і быліны аб слаўных справах і подвігах кіраўнікоў сялянскіх паўстанняў у Беларусі: Налівайкі, Ільі Галоты, Небабы, Крывашапкі, Гаркушы, Вашчылы, Кастуся Каліноўскага і іншых.

Не гледзячы на вякі цяжкіх выпрабаванняў, беларускі народ беражліва захаваў усе багацці свайго духоўнага свету, усе скарбніцы сваёй творчасці, сваю мову. Захаваліся выдатныя беларускія казкі, поўныя вострага юмару, выдумкі, жывога дзеяння, якія едка высмейваюць паноў і адлюстроўваюць лоўкасць, знаходлівасць, кемнасць і бясстрашнасць беларускага селяніна,—захаваліся быліны, песні, прыгаворкі, загадкі. У іх, як у люстры, відаць усё мінулае жыццё народа, яго лепшыя спадзяванні і надзеі, яго гераічная барацьба.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

Усё мастацтва вялікага беларускага народа прасякнута матывамі гэтай барацьбы. Ніякія праследаванні, ніякі гнёт не маглі знішчыць жывых крыніц народнай творчасці.

На працягу ўсёй сваёй гісторыі беларускі народ быў звязан з вялікім рускім народам узамі брацкай дружбы, як з народам родственным, народам высокай культуры, народам блізкіх і родных беларусам звычаяў і жыццёвага ўкладу.

Гэта дружба была на працягу ўсіх вякоў моцнай і неразрыўнай. Усе намаганні польскіх паланізатараў і іншых ворагаў разарваць гэтую гістарычна склаўшуюся дружбу пацярпелі крах.

Пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна, пры брацкай дапамозе рускага народа беларускі народ упершыню ў сваёй гісторыі дабіўся нацыянальнага і соцыяльнага вызвалення, утварэння БССР, як роўнапраўнай саюзнай совецкай рэспублікі.

За годы сталінскіх пяцігодак Беларусь з адсталай дробнасялянскай краіны ператварылася ў перадавую ордэнаносную індустрыяльную рэспубліку з развітой соцыялістычнай сельскай гаспадаркай, стала несакрушальным фарпостам Совецкага Саюза на заходніх рубяжах.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы